# XVII профсаюзная канферэнцыя БДУ

## Больш актыўнасці і ініцыятывы

*Студэнцкая профсаюзная арганізацыя знаходзіцца на уздыме. Усюды адчуваецца рост актыунасці, ініцыятывы і творчасці членау профсаюза. Актыунасць і палітычная спеласць студэнтау асабліва праявіліся у ходзе справаздачна-выбарчай кампаніі. Гэта было бачна і па самаму складу дэлегатау. Як правіла, гэта людзі, праявіўшыя сябе у вучобе, грамадскай рабоце, у працы на цаліне і у калгасах Мінскага раёна. І крытыка на канферэнцыі насіла баявы, востры і у той-жа час дзелавы характар. Як гаспадары сабраліся дэлегаты, і ацэньвалі яны дзейнасць сваёй арганізацыі па-гаспадарску, не па прыгожых фразах, а прынцыпова, па канкрэтных справах.*

*Сур'ёзнае абмеркаванне справаздачных дакладау, аб'ектыуная і вострая крытыка недахопау дазволілі канферэнцыі прыняць дзелавыя рашэнні.*

*Становічым у рабоце прафкома было тое, што цэнтр цяжару у большай ступені быу перанесен у студэнцкія групы. Само жыццё пацвярджае, наколькі гэта карысна. Прамым вынікам гэтага з'яуляеццаператварэнне групы у дружны калектыу, які жыве адзінымі інтарэсамі і клопатамі, рашае агульныя задачы.*

*Недахопам тут з'яуляецца тое, што многія групы былі прадастаулены самі сабе, пры гэтым аслаб уплыў прафкома, што непасрэдна выяулялася на справах групы.*

*Комсорг, прафорг і стараста дауно лічацца асноуным касцяком групы. Становішча спрау на курсе ва многім залежыць ад таго, як будзе працаваць гэты студэнцкі «трохвугольнік». Пасля выбарау комсорг звычайна лічыць, што яго справа—толькі праводзіць сходы, вызначаць комсамольцау для той ці іншай грамадскай работы. Прафорг збірае членскія узносы, стараста адзначае у журнале наведванне студэнтамі лекцый. Сумна жыць у такой групе. І чуць празвінеў званок—усе разляцеліся у розныя бакі. Не «трохвугольнік» патрэбен групе, а актыу, такі, каб ён стау адзіным арганізуючым цэнтрам, ядром групы. Тут перш за усё важны асабісты прыклад актывіста.*

*Актывісты 3-га курса біяфака самі удзельнічаюць у мерапрыемствах, уцягваючы за сабой астатніх студэнтау. Комсорга Салдаценкаву і прафорга Любковіч можна бачыць на вечарах выступаючымі у канцэртах. Яны далі канцэрт сіламі свайго курса і у час праходжэння летняй практыкі. Зусім адваротнае на 3 курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры. Зразумела, добрыя прыклады выхоўваюць куды лепш, чым павучальная мараль.*

*З чаго пачаць?—ламаюць галаву некаторыя кіраўнікі груп. Ажыуляць мастацкую самадзейнасць або захапіць усіх спортам? А у гэты час таварыш-аднакурснік ходзіць як непрыкаяны, не маючы магчымасці ці не жадаючы плённа вучыцца.*

*У бягучым навучальным годзе будзе праводзіцца «Свята песні» у Рызе, а таксама будзе рад юбілейных вечароу, на якіх наша самадзейнасць павінна даць добра падрыхтаваныя канцэрты. Не можа нас не непакоіць тая акалічнасць, што зараз у самадзейных калектывах універсітэта слабая дысцыпліна. Два разы, можна прама сказаць, зрываліся рэпетыцыі хору з-за няяўкі удзельнікаў. Тав. Герасіменка—старшыня праулення клуба, бывае на кожнай рэпетыцыі, а вось чамусьці нашых комсамольскіх важакоу на іх не бачна.*

*І. СТАРАВОЙТАЎ.*

* * *

## Нашы важнейшыя задачы

**(З даклада старшыні прафкома Д. Марчанкі)**

У справаздачным годзе, як і раней, важнейшай задачай прафкома было аказанне практычнай дапамогі рэктарату і партыйнай арганізацыі у падрыхтоуцы высокакваліфікаваных спецыялістау, паляпшэнні паспяховасці і дысцыпліны студэнтау. Поспехі тут бачны, і яны нас радуюць.

Але я лічу мэтазгодным больш спыніцца на недахопах.

Прафком недастаткова удзяляу увагі выкараненню няправільных поглядау некаторых студэнтау, якія лічаць гады вучобы ва універсітэце прыемным «времяпрепровождением». У нас склалася заганная практыка, калі студэнту, атрымаушаму нездавальняючыя адзнакі, дазваляюць пераздаваць экзамены на працягу усяго семестра. А чаму-б яго не прымусіць здаваць экзамены у час канікул? Атрымоуваецца, што гэты студэнт у адным семестры прагуляу і атрымау двойкі, а у наступным семестры ён не наведвае лекцый, бо рыхтуецца пераздаваць экзамен. Вучэбная частка павінна паправіць гэтае становішча.

Студэнты не забяспечаны поунасцю падручнікамі. На хімфаку, напрыклад, няма падручнікау па фізіцы і арганічнай хіміі, на геафаку недастае даведачнай літаратуры, адсутнічаюць дапаможнікі па методыцы геаграфічных даследаванняу. Чаму ва універсітэце не практыкуецца выданне лекцый на правах рукапісу?

Каля 1200 студэнтау працавалі у гэтым годзе на калгасных палях. Аб іх рабоце калгаснікі даюць добрыя водгукі, дзякуюць за вялікую дапамогу. Аднак, у нашым калектыве ёсць яшчэ рад студэнтау, якія грэбуюць працай. З 52 чалавек IV курса аддзялення журналістыкі у калгас паехалі усяго 17 чалавек. Калі становіцца вядомым аб выездзе на сельскагаспадарчыя работы, у медпункце ствараецца доугая чарга у значнай меры не хворых, а здаровых, жадаючых атрымаць даведку аб «хваробе». Профсаюзныя арганізацыі курсау павінны зрабіць адпаведныя вывады у адносінах да такіх студэнтау.

Іншы раз нашы студэнты запрашаюць да сябе у інтэрнат пабочных, парой падазроных асоб. Так, дзяучаты, пражываючыя у пакоі № 67 (корпус «А» па Бабруйскай вуліцы), прывялі 8 студэнтау політэхнічнага інстытута, якія наладзілі там п'янку. З такімі «шапачнымі знаёмствамі», напэуна, былі звязаны часта здараўшыяся крадзяжы у інтэрнаце.

Многія нашы студэнты яшчэ не жывуць у інтэрнаце. Тым не менш, 49 месц у ім заняты асобамі, якія ні у якім разе не з'яуляюцца студэнтамі. Цікава, калі-ж рэктарат адважыцца аддаць гэтыя месцы тым, каму яны належаць?

Работа праулення клуба у справаздачным годзе была накіравана на паспяховую падрыхтоуку да VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтау і да святкавання 40-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Былі падрыхтаваны факультэцкія фестывалі. Лепш усяго яны прайшлі на філфаку і фізмаце. Нядрэнна прайшлі фестывальныя вечары на замежных мовах. Група удзельнікау нашай мастацкай самадзейнасці прымала удзел у фестывалі Вільнюскага дзяржаунага універсітэта. Сіламі нашых калектывау быу падрыхтаваны тэатральна-сатырычны агляд «Ці ёсць у нас таленты?».

Набыта многа касцюмау і розных музычных інструментау.

Разам з гэтымі поспехамі у рабоце праулення клуба ёсць рад недахопау. Да гэтага часу дрэнная застаецца дысцыпліна удзельнікау мастацкай самадзейнасці.

Членам гуртка няма дзе праводзіць рэпетыцыі.

Ці нармальна тое, што толькі пяць працэнтау студэнтау першых курсау удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці? Ніколі за апошнія чатыры гады такога становішча не было! З фізмата, дзе на першым курсе займаецца трэцяя частка усіх першакурснікау універсітэта, у гуртки запісаліся толькі 6 чалавек. Профсаюзны і комсамольскі актыу першых курсау і наогул факультэтау у бліжэйшы час павінны дапамагчы праўленню клуба папоуніць калектывы мастацкай самадзейнасці.

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ПРАФКОМА

**Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне новага складу профсаюзнага камітэта, выбранага на XVII агульнауніверсітэцкай профсаюзнай канферэнцыі.**

**Абавязкі паміж членамі прафкома размеркаваліся наступным чынам:**

**ВАСІН Н.—старшыня. САКАВІК Н. — намеснік па арганізацыйнай рабоце. ВАСІЛЕЎСКІ І.—адказны за палітыка-выхаваучую работу. ЛЕПЧАНКА Н. — старшыня вучэбна-навуковай камісіі. БАТУРЫЦКАЯ Н. — член камісіі па вучэбна-навуковай рабоце. ШЭЎКУНОВА—член камісіі па вучэбна-навуковай рабоце. ЛІСАВЕНКА М.—старшыня культурна-асветнай камісіі. ЛУК'ЯНЦАВА Н.—член камісіі, адказны за універсітэцкую самадзейнасць. КАЧКОЎ Ю.—член камісіі, адказны за факультэцкую самадзейнасць. ЛЕВЫЙ—старшыня жыллёва-бытавой камісіі. ПАШКЕВІЧ Я. — намеснік старшыні жыллёва-бытавой камісіі. ШЧЭРБАЧЭНЯ П.—старшыня аздарауленчай камісіі. ВОДНЕЎ В.—адказны за спартыуную работу. КРУПІЦКІ Б.—адказны за шэфскую работу. ДАНІЛЕНКА Т.—сакратар прафкома.**

## ЗАЎВАГІ ДЭЛЕГАТАЎ

### ВАШ АБАВЯЗАК— ТВАРЫЦЬ НАВУКУ

Наша маладое пакаленне жыве у цудоуную эпоху. Да Кастрычніка 1917 года дзверы вышэйшых навучальных установ у Расіі былі адкрыты толькі для дзяцей прывілеяванага класа.

Моладзь часта недаацэньвае усяго таго, што дала ей Савецкая улада. Яна не ведае, якіх намаганняу каштавала іхнім дзедам і бацькам знішчыць упершыню у сусветнай гісторыі уладу капіталістау і памешчыкау на адной шостай частцы зямнога шара, стварыць першую соцыялістычную дзяржаву, абараніць яе ад нападкау капіталістычных краін, пабудаваць соцыялізм.

У адказ на усе клопаты партыі і урада моладзь павінна павышаць не толькі агульную адукацыю. Яна павінна тварыць навуку, а гэта нельга зрабіць без настойлівай, упартай працы. Неабходна берагчы час, эканоміць яго, каб недарэмна прайшлі гады навучання ва універсітэце.

Увесь універсітэцкі калектыу павінен жыць адным імкненнем: выхоуваць высокакваліфікаваных спецыялістау, якія будуць рухаць уперад навуку, тэхніку, культуру.

(З прамовы рэктара універсітэта А. Н. Сеучанкі)

### СТВАРЫЦЬ КАБІНЕТ БІЯЛОГІІ

У сваіх выступленнях многія дэлегаты гаварылі аб неабходнасці больш увагі звяртаць самастойнай рабоце. А для гэтай работы на біялагічным факультэце не створаны умовы. У значнай меры не хапае падручнікау. Нам патрэбен кабінет біялогіі, у якім была-б уся спецыяльная літаратура.

(З выступлення дэлегата А. Гембіцкага)

### КАБ НА УСЁ ЖЫЦЦЁ ЗАПОМНІЎ

...Часам спецыяльныя прадметы, веданне якіх неабходна на практычнай рабоце, студэнтам чытаюць на першых курсах. Пакуль студэнт закончыць універсітэт, ён многае забудзе з таго, што чыталася 2—3 гады таму назад. Ды у праграме за гэты час могуць быць змяненні. Таму было-б больш мэтазгодным чытаць спецыяльныя прадметы на апошніх курсах.

(З выступлення дэлегата Платонава)

### ЗААХВОЧВАЦЬ ЛЕПШЫХ СТУДЭНТАЎ

Больш трэцяй часткі студэнтау універсітэта займаюцца навукова-даследчай працай, аддаюць ей многа часу. Але прафком не ажыццяуляе ніякіх мер заахвочвання. А неабходна-б было за распрацаваныя тэмы выносіць выканаўцам іх падзякі, узнагароджваць граматамі. Гэта садзейнічала-б большай зацікауленасці студэнтау, займаючыхся навукова-даследчай працай.

(З выступлення дэлегата Прахаровіч)

### ЧАКАЕМ ДАПАМОГІ АД СТУДЭНТАЎ

У рабоце адміністрацыйна-гаспадарчай часткі ёсць яшчэ недахопы, недаробкі. У ліквідацыі іх студэнты павінны прымаць самы актыуны удзел.

У гэтым годзе універсітэт затраціу 300 тысяч рублёў для набыцця абсталявання у аудыторыі і інтэрнаты. Але часта студэнты па-шкодніцку адносяцца да дзяржаунай маёмасці. Напрыклад, пасля правядзення вечара хімічнага факультэта у аудыторыі засталіся паламанымі 3 сталы і 8 крэслау.

Студэнты самі, перш за усё, павінны сачыць за парадкам, змагацца са усякага роду парушальнікамі і шкоднікамі.

(З прамовы прарэктара па адм.-гасп. частцы А. С. Зюба)

### БЕРАЖЛІВАСЦЬ... НА ШКОДУ СПРАВЕ

...Праулене клуба не аказвае нам дапамогі ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці. Нашы студэнты жадаюць займацца у мастацкіх гуртках, але дзе-ж узяць мастацкага кіраўніка? На факультэце ёсць студэнты, якія могуць іграць на баяне або на акардэоне. Але гэтыя інструменты нават на час-другі нам не дае старшыня праулення клуба тав. Герасіменка, абгрунтоўваючы гэта словамі: «Вы падзярэце, вы паламаеце». Такая «беражлівасць» толькі шкодзіць.

(З выступлення А. Казанцавай—старшыні профбюро).

### ЦІ ЧЫТАЕ ХТО З ВАС ПРОФСАЮЗНЫ СТАТУТ?

...Многія члены профсаюза безыніцыятыўныя. Атрымоўваецца гэта таму, што не ўсе яны ведаюць свае абавязкі. Калі прымаюць у рады комсамола, то веданне статута з'яуляецца абавязковым. Чамусьці гэта не патрабуецца пры прыёме у профсаюз.

...Дакладчык назваў забеспячэнне інтэрната корпуса «А» добрым. Але ці адпавядае гэта сапрауднасці, калі студэнты гэтага інтэрната часта застаюцца не толькі без гарачай, але і без халоднай вады?

(З выступлення дэлегата Ю. Новікава)

